УДК 811.161.3

З ГІСТОРЫІ НАЗВАЎ ДАЎНІХ ГАЛАЎНЫХ УБОРАЎ

канд. філал. навук, дац. С.М. СТРУКАВА
(Полацкі дзяржаўны універсітэт)

З улікам комплексных дадзеных помнікаў пісьменнасці (старажытнарускіх і старабеларускіх), лінгвагеаграфіі, этымалагічных і этнаграфічных звестак прааналізаваны некаторыя назвы з мікрагрупы 'даўнія галаўныя ўборы', якія на дэнататыўным узроўні звязаны з мінулым беларускага народа. Кампаненты тэматычнай мікрагрупы маюць розныя этымалагічныя вытокі: адны складаюць запазычанні, якія праніклі ў старабеларускую мову з польскай («канфедэратка») або праз польскае пасрэдніцтва («шлык», «кучма»), другія («сарока», «какошнік») былі запазычаны з рускай мовы, пра што яскрава сведчыць геаграфія гэтых слоў. Гістарычна-этымалагічны аналіз назвы «сарока» 'жаночы галаўны ўбор', якая ўступае ў аманімічныя адносіны з адпаведным арнітонімам, дазваляе вызначыць магчымыя матывы яе ўзнікнення, звязаныя з татэмістычнымі і язычніцкімі ўяўленнямі нашых продкаў. Гісторыя слова «канфедэратка» паказвае, што першапачатковая семантыка слова можа змяняцца і набываць абрадавы характар.

Уводзіны. Галаўныя ўборы, як і адзенне ўвогуле, выконвалі не толькі утылітарную, але і эстытычную, абрадавую і сакральную функцыі. Да таго ж з'яўляліся вызначальнай прыметай нацыянальнай прыналежнасці, сацыяльнага палажэння ў грамадстве. У пэўных сітуацыях сімвалічны сэнс набывалі колер тканіны, з якой выраблялі жаночы галаўны ўбор спецыяльнага прызначэння, і яго форма. Культавы змест апошняга да гэтага часу не зусім разгаданы і параджае розныя версіі. Гістарычна-этымалагічны аналіз назваў галаўных убораў, асабліва старажытных, дазваляе праліць святло на іх ўнутраную форму і вызначыць магчымыя матывы ўзнікнення, звязаныя падчас з язычніцкімі ўяўленнямі нашых продкаў. Прааналізуем некаторыя з назваў гэтай мікрагрупы, выкарыстаўшы пры неабходнасці эстралінгвістычныя звесткі этнаграфічнага і гістарычнага характару.

Асноўная частка. Назвы галаўных убораў уваходзяць у асобную прадметна-тэматычную групу, роднасную прадметна-тэматычнай групе назваў адзення. Найбольш агульнае значэнне, уласцівае яе кампанентам, у старабеларускай мове перадавалася лексемай *шапка* (*чапка*), якая выступала ў якасці родавай намінацыі ў адносінах да цэлага рада слоў канкрэтнага семантычнага зместу: *ермылка* (*елмынка*) – 'невялікая круглая мужчынская шапачка, якая закрывала толькі верх галавы'; *киверъ* – 'высокая спічастая мужчынская шапка'; *колпакъ* – 'высокая мужчынская і жаночая шапка, злёгку пашыраная ўверсе'; *макгерка* 'мужчынская шапка венгерскага крою, упрыгожаная пер'ем'; *мисурка* – 'суконная мужчынская шапка ў форме старажытнага шлема-місуркі'; *мыцка* – 'маленькая круглая мужчынская шапачка'; *нурбарка*, *норбарка* – 'лёгкая мужчынская шапка нямецкага крою'; *полстенка* – 'шапка з лямцу'; *шлык* – 'высокая мужчынская футравая шапка'; *биретъ* (*беретъ*) – 'берэт'; *биретокъ*, *биритецъ* – 'жаночы берэт'; *нурбарка* – 'від шапкі'; *чепецъ* – 'галаўны ўбор замужніх жанчын у выглядзе сеткі або шапачкі'.

Разнавіднасцю суцэльнага адзення з'яўляўся капялюш (ст.-бел. *капелюшъ*, *капалюшъ*). Значную ў колькасных адносінах падгрупу складалі назвы жаночых галаўных убораў, многія з іх служылі абазначэннямі распаўсюджанага галаўнога ўбору ў выглядзе вузкага і доўгага кавалку каштоўнай ці простай матэрыі, які маглі завязваць ці навіваць на галаву рознымі спосабамі: *обрусецъ* – 'хустачка'; *платъ* – 'хустка'; *рантухъ* – 'вялікая хустка'; *рубъ* – 'хустка' (мн. *рубы* 'адзенне'); *рубокъ* – 'тонкая хустка, пакрывала'; *плахта* (*плохта*) – 'палатняная хустка, пакрывала', 'кавалак палатна'; *хуста* – 'хустка' (мн. *хусты* 'адзенне'); *локтушие* – 'від хусткі'; *рантухъ* – 'хустка з палатна, упрыгожаная вышыўкай або карункамі'; *стугъ* – 'від хусткі'; *сударь* – 'хустачка'; *фацелитъ* (*фацеликъ*) – 'хустачка, павязка на галаву'; *шерстухъ* – 'вялікая ільняная хустка'; *наметъ* – 'намітка, жаночы галаўны ўбор'; *наметка* – 'тс'; *серпанокъ* – 'від наміткі'; *завитье* (*завитка*) – 'тонкае галаўное покрыва'; *подвика* (*подвичка*) – 'хустка, жаноцкае галаўное пакрывала'; *подвичка* – 'памянш. да *подвика*'; *завой* – 'чалма, турбан'; *бинда* – 'галаўная павязка, тасьма'; *бендаликъ* – 'галаўная павязка'; *завивка* – 'жаночы гнгалаўны ўбор'; *завитка* – 'палатняная рэч, якую накідвалі на галаву ці плечы'; *завой* – 'галаўны ўбор накшталт чалмы'; *цепликъ* (*цапликъ*) – 'стужка'; *тканица* (*тканка*) – 'жаночы галаўны ўбор у выглядзе доўгага вузкага палатна, упрыгожанага жэмчугам або каштоўнымі металамі'; *брамка* – 'галаўны ўбор у выглядзе вянца'. Спосаб абмотвання тканіны характэрызуе і асобныя мужчынскія галаўныя ўборы, напрыклад: *кидаринъ* – 'галаўны ўбор старазапаветных яўрэйскіх свяшчэннікаў у выглядзе пакрывала, чалмы або турбана'.

Сарока. Галаўны ўбор *сарока* быў элементам касцюма замужняй жанчыны. Існавалі розныя віды сарок: «сарока з павоем», «сорока сажэнная», сарока крылатая» [6]. Сарокі былі розныя і па сваёй канструкцыі, і па колеры. Большасць з іх мела птушыныя атрыбуты: «крылы» і «хвост». Нашэнне сарокі вызначалася рознымі жыццёвымі сітуацыямі – штодзённая сарока маладой жанчыны не мела суцэльнай за-

латой вышыўкі, хаця яе апрацоўвалі залатой ніткай і блішчынкамі; асаблівую сароку насілі пасля родаў і ў Вялікі пост; удовіна сарока звычайна была белая. У ніжэгародскіх будакоў (гэта былі беларускія майданныя сяляне, прыпісаныя да казённых будных майданаў) яна выглядала як фальбона з невялікімі «адросткамі» па баках пярэдняй часткі, гэтыя «адросткі» называліся *рагамі*, адсюль і назва – сарока з рагамі [15, с. 78]. У гэтым сэнсе сарока збліжаецца з такім відам галаўнога ўбору, як *кічка*, якую таксама рабілі рагатай, але ў адрозненне ад кічкі, *сароку* беларускія майданныя жанчыны заўсёды надзявалі на валаснік – ‘сетку ці шапачку з абшыўкаю па краях для хавання валасоў’. Такі галаўны ўбор, які традыцыйна надзявалі на валаснік, зарэгістраваны ў асяроддзі будакоў у XVIII стагоддзі.

Шэраг даследчыкаў лічаць, што дадзеная назва мае даволі яснае паходжанне, прызнаючы яе вытворнай ад назвы птушкі – *сарока* па фармальным падабенстве з сарочыным хвастом і афарбоўкай пер’я. Па назіраннях Д. Зяленіна, патыліца жанчыны ў гэтым уборы вельмі нагадвае птушку з падагнутым крыллем [7, с. 59]. Галоўны ж аргумент у карысць такога падабенства – наяўнасць у галаўным уборы крылля і хваста.

А. Анташэнкава выказвае іншую версію паходжання слова, звязаную з існаваўшым на Русі з часоў язычніцтва культам птушкі. Як вядома, на Русі такія птушкі, як качка і курыца, лічыліся абярэгам, сімвалам замужняй жанчыны: у дзень вяселля маладыя частаваліся смажанай курыцай у залог будучай плоднасці супругі. Згодна разважанняў даследчыцы, ролю абярэга магла выконваць і сарока. Жанчыне пасля ўступлення ў брак надзявалі на галаву ўбор, які меў зааморфную назву, «а гэта азначала, што з гэтага дня добры дух, падтрымкай якога заручыліся такім чынам, быццам браў яе пад абарону і абяцаў вялікае патомства» [1]. Да таго ж, даводзіць яна далей, славянскі касцюм меў яруснае дзяленне, пры якім галаўныя ўборы былі звязаны з сонцам, небам, таму характар арнамента быў у іх іншы, чым у рубах. На галаўных уборах прысутнічалі ў кампазіцыі арнамента салярныя (сонечныя) знакі. Такім знакам птушка якраз і была. Магчыма, што гэты элемент у арнаменце паўплываў на назву ўсяго ўбору ў цэлым. Тым больш што ў якасці аксэсуараў да гэтага галаўнога ўбору часта выкарыстоўваліся падвескі з птушынага пер’я, пуху [1]. Выказаная гіпотэза цікавая, але яна патрабуе пацвярджэння дадатковымі даследаваннямі.

Какошнік. Старадаўні рускі галаўны ўбор – какошнік – бытаваў у XIX стагоддзі ў купецкім і сялянскім асяроддзі (галоўным чынам у губернях), а ў дапятроўскай Русі – і ў баярскай. Рабілі яго на цвёрдай аснове, зверху аздаблялі парчой, пазументам, бісерам, пацеркамі, перламі, больш багатыя – каштоўнымі камянямі. Вядомы какошнікі кічкападобныя, ручніковыя, у выглядзе чапца, шапачкі, шырокай тулы, шытай золатам і пазументам. Галоўная адметнасць какошніка – два рагі, злучаныя «князьком», якія ўтваралі своеасаблівы грэбень. Адным з самых старажытных тыпаў какошніка лічыцца паўднёварускі, у якога прамы грэбень размешчаны ўпоперак галавы ад вуха да вуха. Мяркуюць, што гэты тып паслужыў прататыпам украінскага каптура [1, с. 61]. У Курскай губерні форма какошнікаў была двухграбеньчатай або седлападобнай [8].

Многія даследчыкі ўказваюць на тое, што какошнік насілі толькі замужнія жанчыны, аднак у слоўніку У. Даля, адзначаецца, што насілі яго і дзяўчаты [7]. На нашу думку, разуменне какошніка як галаўнога ўбору замужніх жанчын звязана з той акалічнасцю, што *какошнікам* часам называлі разнавіднасць галаўнога ўбору *сарокі*, у якой крылы зліліся з донцам [9], а паколькі сароку не насілі дзяўчаты, не ўступіўшыя ў шлюб, такое абрадавае значэнне было перанесена і на назву *какошнік*.

Г. Маслава на аснове фактаў ужывання слова *какошнік* як абазначэння *сарокі* (галаўнога ўбору) выказвае арыгінальную версію аб тым, што какошнік з’явіўся ў выніку зліцця сарокі з кічкай – цвёрдай асновай [10], а гэта значыць, што слова *какошнік* – больш позняе па часе ўзнікнення, чым *сарока*.

Пра глыбокую старажытнасць какошніка сведчаць старажытная гліняная статуя на тэрыторыі Кіеўшчыны, а таксама раскопкі, праведзеныя на тэрыторыі Тамбоўскай вобласці, дзе быў знойдзены падобны галаўны ўбор, аднесены вучонымі да VII стагоддзя. Аднак, у які час з’явілася сама назва, невядома, бо ў ранніх пісьмовых помніках яна не адлюстравана.

Лексічная намінацыя *кокошникъ* ‘даўні рускі галаўны ўбор замужняй жанчыны’ фіксуецца ў старажытнарускіх помніках толькі з 1671 года: *Восмь кокошниковъ золотыхъ полотняныхъ; Два кокошника низаны жемчугомъ, одинъ отласнои* [11, VII, с. 230].

Месца распаўсюджання слова *кокошник* у глыбіні рускай моўнай тэрыторыі (пскоўскія, цвярскія, калужскія, валагодскія, наўгародскія і іншыя гаворкі), адсутнасць паралелей у іншых мовах сведчаць аб тым, што яно з’яўляецца рускай інавацыяй.

Слова *какошнік* вядома і асобным беларускім гаворкам, напрыклад, на Магілёўшчыне (Мсціслаўскі р-н) яна ўжываецца са значэннем ‘галаўны ўбор, наметка’: *Яна сягоньня хадзіла біз какошніка* [4, с. 217]. Беларускі *какошнік* у гэтым выпадку непасрэдна суадносіцца з рускай назвай і можа разглядацца як вынік гістарычнай сувязі ўсходнебеларускіх гаворак з рускімі або як інфільтрацыя з рускіх гаворак. Не выключаецца магчымасць, што слова было прыўнесеным з мовы перасяленцаў.

Паходжанне рускай назвы *кокошник* ‘старадаўні рускі жаночы галаўны ўбор у выглядзе ўпрыгожанага шчытка над ілбом’ суадносяць са старажытнаславянскай назвай курыцы (або пеўня) *кокошь* па той прычыне, што характэрны для какошніка грэбень па форме нагадваў адпаведны грэбень на галаве ў птушкі. Такога погляду прытрымліваюцца Д. Зяленін і М. Фасмер, іншыя этымолагі звязваюць назву галаўнога

ўбору з рускімі назвамі птушак: *кокоша*, *кокошка*, *сорока* [19, IV, с. 111]. Матывы наймення па гэтай версіі такія самыя. В. Стасаў бачыць сувязь слова з фінскім *кюкко* – курыца [14]. Існуе таксама недастаткова абгрунтаванае меркаванне аб візантыйскім ці татарскім паходжанні тэрміна.

Кучма. У мове старажытнарускай пісьменнасці лексема *кучма* абазначала ‘шапку з футравым верхам і футравай падкладкай’. Тэкст, датуемы 1589 годам, змяшчае апісанне гэтага галаўнога ўбору, які, верагодна, належаў знатнаму чалавеку, саноўнай асобе, паколькі быў аздоблены залатымі ўпрыгожаннямі, каштоўнымі камянямі і перламі: *Кучма соболия, на ней запона золота съ травами, а въ ней изумрудъ зеленъ… кругомъ ее и кругомъ запоны круживо низано жемчугомъ въ шахматы* [13, I, с. 1383; 11, VIII, с. 152].

У старабеларускіх пісьмовых помніках лексема *кучма* значыцца з 1590 года са значэннем ‘футравая шапка-вушанка’: *сорвали теж з него кучму подшитую куницами, которая коштавала пят золотых польских* [5, XVIII, с. 259]; *на голове его великая кучма* [3, с. 183]. У няпоўным маскоўскім спісе Александрыі 1697 года *кучмой* названы ‘галаўны ўбор з каштоўных металаў і камянёў, які па форме нагадваў футравую кучму’: *на головѣ его велика» кичма wт чистого злата, и wт камен» анъдрака, з великим бисеромъ* [5, XVIII, с. 259]. У «Энцыклапедыі Вялікага княства Літоўскага» прыводзіцца апісанне гэтага віду галаўнога ўбору як высокай шапкі з сінім верхам, абшытай футрам собаля [18, с. 96].

Слова ведаюць іншыя славянскія мовы: руская: *кучма* – ‘футравая шапка, абалавуха; малахай’, украінская: *кучма* – ‘футравая калматая шапка’; славенская: *kûč- ma*; сербахарвацкая: *кȳчма*; польская (устар.): *kuczma*; славацкая: *kučma.*

У беларускую мову лексема *кучма*, на думку А. Булыкі і М. Фасмера, пранікла праз польскае пасрэдніцтва з венгерскай мовы (польск. *kuczma* < венг. *kucsma* ‘баранавая шапка’) [3, с. 183]. В. Мартынаў гэты погляд лічыць памылковым, аднак не аргументуе сваю пазіцыю і ўзводзіць слова да праславянскага *kučьma* < *kuka* [19, V, с. 177]. Мы не выключаем магчымасці пранікнення слова *кучма* менавіта з польскай мовы, паколькі старабеларускай мове вядомы дэрыват з гэтым коранем, утвораны пры дапамозе прадуктыўнага ў польскай мове словаўтваральнага сродку *-usk(o) – кумчиско.*

Этымолаг Кіш збліжае слова з сербахарвацкім *кȕкма* ‘чуб, хахол’, славенскім *kûkma* ‘тс’, для параўнання прыводзіць беларускае слова *кучма* са значэннем ‘густыя валасы’. Паралель з сучасным словам *кучары* ‘кучаравыя або завітыя валасы’ праводзіць і В. Мартынаў [19,V, с. 177].

На беларускай глебе ўзнік суфіксальны дэрыват *кучомка* ‘шапка футрам наверх’, адлюстраваны ў творах беларускай мастацкай літаратуры: *На галаве – авечая кучомка, на плячах кажух* (Лобан), *– Ці бачыш што? – Не, так, нічога! – Гаворыць Костусь, а ў самога На лоб кучомка напаўзае…* (Колас).

Канфедэратка. *Канфедэраткай* называлі раней высокую шапку на чатыры рагі пунсовага (кармазінавага, гранатавага) або цёмна-сіняга колеру, абшытую цёмна-шэрай або цёмна-карычневай аўчынай. Гэты галаўны ўбор аздаблялі пер’ем чаплі, якое замацоўвалі залатой або сярэбранай спражкай. У «Энцыклапедыі Вялікага княства Літоўскага» адзначаецца, што верх гэтай шапкі мог быць чырвоным, зялёным і чорным [18, с. 96]. Канфедэраткі насілі многія ўдзельнікі паўстання 1863 – 1864 года ў Польшчы, Беларусі і Літве. Разнавіднасць канфедэратак з больш высокім і шырокім верхам і казырком стала прататыпам *кашкета* (ківера) польскіх уланаў. У сярэдзіне XIX стагоддзя канфедэратка як жаночае ўбранне было сімвалам народнага жалобнага строю [17, IV, с. 91 – 92].

Слова *канфедэратка* не зафіксавана ў старабеларускіх помніках пісьменнасці, што, аднак, не выключае функцыянавання яго ў той перыяд, паколькі ў старабеларускіх тэкстах адзначаецца звязаная з ім словаўтваральнымі адносінамі лексема *конфедэратъ* ‘удзельнік канфедэрацыі – часовага ваенна-палітычнага саюза гарадоў, шляхты, духавенства ў Рэчы Паспалітай у 2-й палове XVI-XVIII стагоддзя’: *конъFедератове жолнере великимъ кгвалтомъ над повинъность мижыцкуи собе зарабл#ли* [5, XV, с. 280]. Назва *канфедэратка* была запазычана ў барскіх канфедэратаў* і разглядаецца як транслітарацыя польскага слова *konfederatka*.

Шлык. Шлык уяўляў сабой высокі каўпак з футра ці тканіны, які насілі зверху шапкі. Назва галаўнога ўбору *шлыкъ* у помніках старабеларускай пісьменнасці фіксуецца з 1404 года: *шлыкъ за три гроши*; *шлыкъ баряный* [3, с. 365]; *князь великій сѣлъ на мѣстцу своемъ господарскомъ и взложилъ шлыкъ на себе бараній, а ормякъ сермяжный* [3, XXII, с. 320]. Фактычна слова *шлыкъ* супадала па семантыцы са словам *каўпак*. Хаця лічыцца, што яму ўласцівы былі два значэнні ‘задняя частка галаўнога ўбору’ і ‘каўпак’. У «Энцыклапедыі Вялікага княства Літоўскага» слова *шлык* тлумачыцца як мужчынскі і жаночы конусападобны галаўны ўбор з каштоўных відаў футра і чырвонага сукна (у простага люду былі саламяныя шлыкі) [18, с. 96].

Са значэннем ‘лямцавая востраканцовая, накшалт каўпака, шапка’ слова *шлыкъ* прыводзіцца ў «Словаре белорусского наречія» І. Насовіча: *маргелка твоя, як шлыкъ* [10, с. 713]. У паўночна-ўсходніх гаворках XIX стагоддзя бытавала прымаўка з гэтым словам: *дали мнѣ шлыкъ, я подъ вороты шмыкъ* [10, с. 713]. *Шлык* ‘лямцавая шапка’ ўжывалася і ў 20-х гадах XX стагоддзя, аб чым сведчаць дадзеныя «Беларуска-расійскага слоўніка» М. Байкова і С. Некрашэвіча [2, с. 349].

* Барскія канфедэраты – шляхта Рэчы Паспалітай, аб’яднаная ў 1768 годзе ў мястэчку *Бар* Падольскага ваяводства ў ваенна-палітычны саюз супраць караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага і расійскага пратэктарату над краінай.

Беларускай мовай слова *шлык* было запазычана са старапольскай, апошняй яно вядома з 1325 года. Польскае *szłyk* у сваю чаргу ўзыходзіць да турэцкага *bašlyk* [3, с. 365]. М. Фасмер выказвае меркаванне, што рускае *шлык* і ўкраінскае *шлик* утварыліся шляхам скарачэння *башлык*, а ўжо ад іх польскае *szłyk* (XVI – XVII стст.) [16, IV]. Насуперак М. Фасмеру, Г. Судакоў лічыць слова *башлык* больш познім па часе ўтварэння.

Са старабеларускай і старапольскай моў слова *шлык* пранікла ў рускую мову. У помніках старарускай пісьменнасці *шлык* ‘каўпак’ адзначаецца з 2-й паловы XVI стагоддзя, у тэкстах XVII стагоддзя сустракаецца пры апісанні адзення іншаземцаў. У XIX стагоддзі слова *шлык* са значэннем ‘шапка, чапец, каўпак’ характарызавалася ўжо як агульнарускае.

Высновы. Прааналізаваныя кампаненты тэматычнай мікрагрупы ‘галаўныя ўборы’ маюць розныя этымалагічныя вытокі: адны з іх праніклі ў старабеларускую мову з польскай мовы (*канфедэратка*) або праз польскае пасрэдніцтва (*шлык, кучма*), другія (*сарока, какошнік)* былі запазычаны з рускай мовы, пра што сведчыць маргінальны (ускраінны) характар ужывання (*какошнік*) або функцыянаванне ў межах пэўнай беларускай этнічнай супольнасці (*сарока*). Далейшае развіццё запазычанняў на беларускай глебе звязана з семантычнай (*канфедэратка* ‘галаўны ўбор удзельнікаў паўстання’ → *канфедэратка* ‘жалобны галаўны ўбор’) і словаўтваральнай мадыфікацыяй (*кучма* → *кучомка*).

ЛІТАРАТУРА

1. Антошенкова, Е.В. Вот тебе кокуй, с ним и ликуй! Головные уборы восточных славянок / Е.В. Антошенкова // Русская речь. – М.: Наука, 1996. – № 1. – С. 59 – 62.
2. Байков, М. Беларуска-расійскі слоўнік / М. Байкоў, С. Некрашэвіч. – Мінск: Народная асвета, 1993. – 360 с.
3. Булыка, А.М. Даўнія запазычанні беларускай мовы / А.М. Булыка; рэд. А.І. Жураўскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1972. – 381 с.
4. Бялькевіч, І.К. Краёвы слоўнік усходняй Магілёўшчыны / І.К. Бялькевіч – Мінск: Навука і тэхніка, 1970. – 511 с.
5. Вялікае княства Літоўскае: Энцыкл.: у 2-х т. / рэдкал. Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск: Бел. энц., 2005. – 686 с.
6. Гістарычны слоўнік беларускай мовы. Вып. XV / АН БССР, Ін-т мовазн. імя Я. Коласа; гал. рэд. А.І. Жураўскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1996. – 311 с.; Вып. XVIII / пад рэд. А. Булыкі; склад. А. Булыка [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1999. – 374 с.; Вып. XXII / пад рэд. А. Булыкі; склад. А. Булыка [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 2002. – 443 с.
7. Даль, В. Толковый словарь живого великорусского языка: в 4-х т. / В. Даль. – М.: Рус. яз., 2003. – Т. II – 779 с.; Т. IV. – 688 с.
8. Зеленин, Д.К. Женские головные уборы восточых (русских) славян / Д.К. Зеленин. – Slavia, 1926. – Вып. II (гл. арт.: Антошенкова Е.В. [1]).
9. Котков, С.И. Очерки по лексике южновеликорусской письменности XVI – XVIII вв. / С.И. Котков. – М.: Наука, 1970. – 280 с.
10. Маслова, С. Народная одежда русских, украинцев, белорусов в XIX – нач. XX в. / С. Маслова // Восточнославянский этнограф. сб. – М., 1956. – Т. 31. – 805 с.
11. Насовіч, І.І. Слоўнік беларускай мовы / І.І. Насовіч. – Мінск: БелСЭ, 1983. – 792 с.
12. Словарь русского языка XI – XVII вв. / АН СССР, Ін-т рус яз.; гл. ред. Ф.П. Филин; ред. Г.А. Богатова; ред. вып. Г.Я. Романова / состав. Г.А. Богатова, О.В. Малкова, Г.Я. Романова – М.: Наука, 1981. – Вып. VIII. – 351 с.
13. Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй часткі Беларусі і яе пагранічча: у 5-ці т. / Ю.Ф. Мацкевіч [і інш.]; пад рэд. Ю.Ф. Мацкевіча. – Мінск: Навука і тэхніка, 1986. – Т. V. – 563 с.
14. Срезневский И.И. Словарь древнерусского языка: в 3 т. / И.И. Срезневский; предисл. Г.А. Богатовой. – М.: Книга, 1989. – Т. I. – 1419 с. – (Репринт).
15. Стасаў, В.В. Русский народный орнамент / В.В. Стасаў – Вып. I. – 1872 (гл. арт.: Антошенкова Е.В. [1]).
16. Ухмылина, Е.В. Название старинной женской одежды нижегородских будаков: Исследования и материалы по русской древнеславянской языковой истории / Е.В. Ухмылина. – М.: Наука, 1975. – Т. I. – 255 с.
17. Фасмер, М. Этимологический словарь русского языка: в 4 т. / М. Фасмер; пер. с нем. и доп. О.І. Трубачёва; под ред. и с предисл. Б.А. Ларина. – 2-е изд., стер. – М.: Прогресс, 1987. – Т. IV. – 860 с.
18. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск: Бел. энц., 1997. – Т. IV. – 432 с.
19. Этымалагічны слоўнік беларускай мовы. – Т. IV / АН БССР, Ін-т мовазн. імя Я. Коласа; склад. В.Дз. Лабко, І.І. Лучыц-Федарэц; рэд. В.У. Мартынаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1988. – 327 с.; Т. V / уклад. В.У. Мартынаў, І.І. Лучыц-Федарэц; рэд. В.У. Мартынаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1989. – 320 с.

Паступіў 25.07.2007